НАРКОМВАЕНМОРУ, СТОЙКАМУ БАЛЬШАВІКУ-ЛЕНІНЦУ ТАВ. ВАРАШЫЛАВУ—

БАЯВОЕ КОМСАМОЛЬСКАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ

ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 28 (1297) | ЧАЦЬВЕР, 5-га лютага 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 "
6 месяцаў	1 р. 80 "
1 год	3 р. 60 "

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25,
сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ Х.

Кошт асобнага №—2 кап.

БЫЦЬ ГАТОВЫМІ

Посьпехі нашага социялістычнага будаўніцтва за першыя два гады пяцігодкі, самаадданая творчая дзейнасьць рабочае клясы пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі па заканчэньню фундаманту социялістычнай экономікі ў рашаючым, трэцім годзе пяцігодкі, рост колгаснага будаўніцтва і ліквідацыі апошняй капіталістычнай апоры на вёсцы—кулака як клясы на базе суцэльнай колектывізацыі—прыводзяць у шаленства загніваючы капіталістычны сьвет, які губляе апошнюю надзею на рэстаўрацыю капіталізму ў СССР. З кожным днём у нас узрастае социялістычнае будаўніцтва: будуюцца новыя фабрыкі і заводы, разьвіваецца і машынізуецца сельская гаспадарка, ліквідавана ў асноўным беспрацоўе. У капіталістых з кожным днём паглыбляецца крызіс, расьце ўпадак прамысловасьці, сельскай гаспадаркі, расьце беспрацоўе.

Як выхад з гэтага становішча, капіталістыя ўсіх краін, прыкрываючыся хлусьлівай балбатнёю аб міры, аб разброеньні, шалёна рыхтуюцца да нападу на СССР, да зрыву социялістычнага будаўніцтва.

Будучая вайна, адлегласьць да якое з кожным днём скарачаецца, будзе вайною клясаў, будзе як ніколі ўпартай і бязьлітаснай. Галоўнае месца займуць машыны і прытым з надзвычайна высокай тэхнікай. Гэтая вайна „мэханізуецца, машынізуецца, індустрыялізуецца, ператвараючыся ў агромністую, вельмі складаную фабрыку зьнішчэньня людзей".

Ленінскі комсамол памятае слаўныя бойкі з грамадзянскай вайны, памятае як, аддаўшы на фронт усё лепшае, што было ў яго шэрагах, ён мобілізаваў усіх 19-гадовага ўзросту комсамольцаў для абароны адзінай ва ўсім сьвеце пролетарскай дзяржавы.

Чырвонаштандартны ленінскі комсамол, пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, дабіўся вялікіх посьпехаў у гаспадарчым, рацыянальна-культурным будаўніцтве, разьбіваючы ўшчэнт вылазкі клясавага ворага, у непрымірымай барацьбе змагаўся супроць розных ухілаў ад генэральнай лініі партыі, за ідэолёгічна-клясавую чыстату ў выхаваньні мас комсамольцаў і моладзі. І зараз перад тварам рэальнай ваеннай небясьпекі, павінен організаваць работу так, каб уся працоўная моладзь займалася вайсковай справай. Наш баявы лёзунг: — Кожны комсамолец, кожны малады рабочы, кожны малады селянін трэніруйся, вучыся як перамагаць клясавага ворага ў адкрытых бойках на франтох будучай грамадзянскай вайны. Кожны малады рабочы, малады кольгасьнік, кожны працоўны вучыся ўладаць кулямётам, вінтоўкай, вывучай строй сваёй арміі: ты павінен умець удзельнічаць і перамагаць у бойках". Пастанова IX зьезду УсеЛКСМ аб вайсковай рабоце вайсковым выхаваньні комсамольцаў і моладзі павінна быць безадкладна выканана, бо „комсамольцы ня могуць не жадаць па-сапраўднаму, па-бальшавіцку абараняць сваю социялістычную бацькаўшчыну, абараняць краіну рабочых і сялян".

Пасіліць збор сродкаў на пабудову самалётаў, дырыжабляў, наладзіць сувязь з сутаварыскімі, падшэфнымі вайсковымі часткамі, распачаць падрыхтоўку да комплектаваньня вайсковых, школ, адабраўшы ў гэтыя школы лепшых ударнікаў — комсамольцаў з прадпрыемстваў, саўгасаў, колгасаў—чарговая задача комсамолу. Усю гэтую работу па ўзмацненьню абароназдольнасьці краіны мы павінны ўвязаць з выкананьнем і перавыкананьнем прамфінпляну, з пашырэньнем соц. спаборніцтва і ўдарніцтва, організацыяй социялістычнага конвэеру якасьці на прадпрыемствах, з організацыяй новага прыліву ў колгасы, пашырэньнем падрыхтоўчай работы да вясеньняга севу.

50-гадовы юбілей правадыра і аднаго з організатараў нашай слаўнай рабоча-сялянскай Чырвонай Арміі, бальшавіка сьлесара,—Клімэнта Варашылава мы павінны правесьці пад сьцягам выкананьня гэтых лепшых падарункаў узмацненьня абароназдольнасьці краіны.

„Бальшавікі БССР у патрэбны момант гатовы біцца на перадавых позіцыях пад Вашым выпрабаваным кіраўніцтвам"

Наркомваенмору К. Е. Варашылаву

У дзень Вашай 50-гадовай гадавіны шлём бальшавіцкае прывітаньне ад імя КП(б)Б і працоўных Савецкай Беларусі.

Вітаем Вас, як праверанага вучня і саратніка Леніна, стойкага барацьбітага за справу пролетарыяту і правадыра пераможнай Чырвонай арміі, якая пры Вашым актыўным баявым удзеле вызваліла Савецкую Беларусь ад банд міжнароднага імпэрыялізму. Бальшавікі Беларускай Рэспублікі, фарпосту Савецкага Саюзу, з асаблівай ўвагай адносяцца да справы абароны краіны і, у патрэбны момант, гатовы біцца на перадавых позыцыях пад Вашым баявым выпрабаваным кіраўніцтвам.

ЦК КП(б)Б—ГЕЙ

Бальшавіку, луганскаму сьлесару, адважнаму салдату рэволюцыі, Наркамваемору Варашылаву

Ад імя статысячнай арміі Ленінскага Комсамолу Беларусі старому бальшавіку, луганскаму сьлесару, адважнаму салдату рэволюцыі, наркомваенмору тав. Варашылаву ў дзень 50-годзьдзя—баявое комсамольскае прывітаньне. Твая адданасьць і барацьба за справу рабочае клясы, непрымірымае змаганьне за ленінізм—лепшы прыклад для комуністычнага выхаваньня комсамольцаў, рабочай, колгаснай бядняцка-серадняцкай моладзі.

Ударна, па-баявому змагаючыся пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі за выкананьне пляну рашаючага трэцяга году пяцігодкі, комсамол Савецкай Беларусі у любую хвіліну па першаму закліку партыі і ўраду гатоў стаць пад баявыя сьцягі слаўнай рабоча-сялянскай Чырвонай арміі і не пакіне яе сталёвых радоў да канчатковай перамогі у бойках за сусьветны кастрычнік.

Няхай жыве сусьветная пролетарская рэволюцыя!

Няхай жыве РСЧА—узброены атрад міжнароднага пролетарыяту!

Няхай жыве чырвоны камандарм—тав. Варашылаў!

Няхай жыве Усесаюзная комуністычная партыя (бальшавікоў) арганізатар і правадыр Чырвонай арміі

ЦК ЛКСМБ

СЬЛЁСАР, БАЛЬШАВІК, НАРКОМ

Клімэнт Яфрэмавіч Варашылаў нарадзіўся ў 1881 годзе,

1896 год— Клімэнт Яфрэмавіч паступіў рабочым на завод пры станцыі Алчэўскай. Папаўшы ў ка-



Луганскі сьлёсар тав. Варашылаў

тэгорыю „ненадзейных", ён сыстэматычна прасьледуецца поліцыяй

1899 год—пад яго кіраўніцтвам у чыгунналіцейным цэху выбухае забастоўка рабочых,

1903 год—Варашылаву ўдаецца паступіць на завод Гантмана ў Луганску. Пранікаючыся ўсё больш рэволюцыйнай барацьбою, ён уступае ў расійскую соц-дэмократычную рабочую партыю, а ў 1904 годзе ўваходзіць у ЦК РСДРП і адразу далучаецца да фракцыі бальшавікоў.

1905 год—Клімэнт працуе на Гантманскім заводзе і кіруе рабочымі забастоўкамі.

1906 год—Варашылаў-удзельнік Стокгольмскага зьезду. Тут ён знаёміцца з Уладзімерам Ільлічом і іншымі выдатнымі бальшывікамі.

1907 год—Варашылаў—дэлегат ад Луганску на агульна-партыйным зьезьдзе ў Лёндане, і на паўднёва-расійскай партконфэрэнцыі ў Кіеве.

У дні лютаўскай рэволюцыі Варашылаў уваходзіць у Піцерскі савет рабочых дэпутатаў

1918 году тав. Варашылаў організаваў першы партызанска-комуністычны атрад і выступіў супроць нямецкіх окупанцкіх войск.

1919 год—Варашылаў назначаецца членам Рэволюцыйнага Савету Першай коннай арміі.

1921 год—Варашылаў камандуючы войскамі паўночна-каўкаскай ваеннай акругі.

1924 год—член Рэўваенсавету СССР

З 1926 году—член Політбюро ЦК УсеКП(б).

За баявыя заслугі Варашылаў узнагароджаны 4 ордэнамі чырвонага сьцягу і ганаровай зброяй.

Пасьля сьмерці тав. Фрунзе, тав. Варашылаў прызначаецца на пост кіраўніка ўсімі ўзброенымі сіламі Савецкага Саюзу.



Клімэнт Яфрэмавіч

I.

Армія Чырвоная ўсіх мацней
Законы
намі пісаны
і шабляй
і крывёй
І гэта зналі
Вільсаны
з Пуанкарэ-вайной.
—„А с нами Ворошилов первый
красный офицер,
сумеем кровь пролить за СССР..."
Нагу паставім
ў стрэмя мы—
вятрамі не дагнаць...
Скажы, Клімэнт Яфрэмавіч—
Мы сядзем на каня.
І домны перагрэлі мы,
каб першым быў
завод.
Скажы, Клімэнт Яфрэмавіч—
і ў бойцы
кулямёт.
Мы адкідаем
стому,
калі ідзем
у галёп.
Ты сябра нам
вядомы.
у бурны Перакоп.
Мы рвалі з іх
пагоны
І з пана
каптацы.
З табой і
першай коннай—
а ў нас растуць сыны.
Іх не атруціш
газам,
вучылі іх гады.
Яны з табою
разам,
таварыш правадыр!

2.

Ты помніш як:

Чорнае мора кідалася чортам
за цуглі ірвала, а коні іржалі...
А коньнікі крылі і ў бога і ў чорта
коні шалёна, як чэрці скакалі.
А хвалі ўзьнімаліся ў стан чалавечы
коньнікам цяжка імчацца праз хвалі...
А сэрца ў агні, дык і пудзіцца нечым
коньнікі порах ля сэрца трымалі.

Салёны Сіваш раскідаў эполеты,
разносіў на цуры нашчадным і прыбоем...
І кідалі штормы на бераг адпетых
І клікалі штормы жыцьцё маладое.

А хвалі цаплялі, душылі за шыю,
а коньнікі везьлі сухімі набоі.
І вёз праз прыбоі Клімэнт
Варашылаў
агні рэволюцый і клясавых боек.

3.

І цяпер:

Мы кольцы гор
прайдзем
між гор.
Ты быў
шахцёр
і я
шахцёр.
Наш пройме
штык.
між лесу
цік.
Ты—бальшавік!
Я—бальшавік.
Дзяды хадзілі з горам
Сабе шукаць
крыжы—
з фэльдмаршалам
Суворавым
мякінаю каб жыць.
А мы—
на чорта
гэта нам.
Мы самі
пераможам.
Мы самі сабе
гэтманы
і рукі ў нас
і розум.
І тут ня скажаш,
вершам;
а хто сягоньня
лепшы,—
і я ліцейнік першы
І кулямётчык першы.
А ёсьць яшчэ
агністых,
вазьмі ды толькі выстрай:—
з колгасаў трактарыстых,
надзейных—
мотарыстых.

4.

Нашы сілы кім улічавы
буйны шквал?
Прагуляўся пад Царыцыным
адмірал.
Не дабег ад кулі наскае—
на вакзал.
Пагубляў палеты царскія
адмірал.
Ён прышоў тады „рабоўнікам,
а што узяў?
Дзе твае цяпер палкоўнікі,
адмірал?
Сваіх коні перагрэлі мы—
ставіцх кон.
Ты нас вёў Клімэнт Яфрэмавіч
на агонь.
І таму, што секлі густа іх—
клалі ў рад.
прыплылі вятры індустрыі
ў Сталінград.

5.

І зноў як толькі
стрэламі
Граніцы зазьвіняць,
Скажы, Клімэнт Яфрэмавіч,—
Мы сядзем на каня.
Мы пройдзем межы сьвету
праз хвалі і агні—
Каб біўся пульс саветаў—
спакойна ў комунізм.

Пятрусь Броўка

Менск, студзень, 1931 г.

МАЦАВАЦЬ СССР—
ЦЫТАДЭЛЬ СУСЬВЕТНАГА ПРОЛЕТАРЫЯТУ

Капіталістычныя краіны шалёна рыхтующа да нападу на краіну, якая будуе соцыялізм. Будучая вайна—вайна машын, вайна навукі, вайна тэхнікі. Аўладаць арытмэтыкай будучых боек, бязупынна мацаваць абарону краіны саветаў, змагацца за бальшавіцкія пляны, за якасьць

З прамовы наркомваенмора СССР тав. ВАРАШЫЛАВА на IX зьездзе УсеЛКСМ

Мы жывём у выключную эпоху.

Наша старэйшае пакаленьне бальшавікоў было шчасьліва ўзяць на сябе агромністую гістарычную задачу зруйнаваньня старога сьвету, сьцен, каб на расчышчаным месцы пачаць пабудову новай чалавечай грамады. Мы дабудоўваем ужо фундамант гэтай новай грамады, і цяпер ад нас, а яшчэ больш ад вас—комсамольцаў і ад усіх хто ідзе ўсьлед за намі,—за нашых юных піонэраў,—залежыць, каб на гэтым фундаманце пасьпяхова праводзілася будаўніцтва вялікага соцыялістычнага будынку. Гэты будынак мы будуем і будзем будаваць такім, каб ён сваімі дасканалымі формамі прыцягнуў увагу і мільёнаў прыгнечаных усяго сьвету, каб гэтыя мільёны, гледзячы на нашыя дасягненьні, на вынік нашых работ, сьледавалі-б нашаму прыкладу.

Таварышы! Будуючы соцыялізм у нашай краіне, мы ведаем з якімі цяжкасьцямі зьвязана гэта нябачаная у сусьветнай гісторыі будоўля. Нам прыходзіцца змагацца з шматлікімі цяжкасьцямі. Мы вядзем жорсткую барацьбу ня толькі з знадворнымі, але і ўнутранымі контррэволюцыйнымі, адкрыта варожымі нам сіламі. І ва ўласных шэрагах, ва ўсіх організацыях, якія ўтвораны пераможным пролетарыятам на чале з вялікім яго правадыром Леніным, нам таксама прыходзіцца весьці настойлівую барацьбу за чыстату нашай комуністычнай лініі. За генэральную лінію нашай партыі. Без няўхільнага праводжаньня ўсімі намі генэральнай лініі нельга забясьпечыць посьпех нашай будоўлі. Іменна, яна, гэтая генэральная барацьба за соцыялізм; зьяўляецца галоўным момантам, які згуртоўвае і цесна зьвязвае нашы пролетарскія шэрагі, які асьвятляе далейшыя шляхі нашай барацьбы, работы і вялізарнейшых дасягненьняў.

К сучаснаму моманту

наша партыя моцная, адзіная і згуртаваная

Таксама добрае становішча комсамольскай організацыі, якая зьяўляецца надзейнай апорай, зьменай, верным супрацоўнікам і прыхільнікам партыі ў яе цяжкай барацьбе і рабоце. З гэтага, аднак, было-б няправільна рабіць заключэньне, што мы маем права хоць на адзін міг забывацца аб няміласьцівых фактарах аб'ектыўнага і суб'ектыўнага парадку, якія абкружаюць нас, якія ня могуць ня ціснуць на нас з розных бакоў. І ў далейшым мы павінны быць сапраўднымі ленінцамі і захоўваць нашу партыю ў чыстыні ідэолёгічнага парадку, у якім яна знаходзіцца ў сучасны момант. Усякаму роду опортуністычным скажэньням, якія імкнуцца проста ці ўскосна прабівацца ў ідэолёгію нашай партыі, у нашу работу, павінны і ў далейшым сустракаць і ў партыі, і ў комсамоле жорсткі адпор, бо, паўтараю, бяз гэтага немагчымы нашы далейшыя посьпехі. Правыя і „левыя" опортуністы, сьвядомыя і несьвядомыя посьбіты ідэй кулацтва і буржуазіі, ў далейшым павінны бязьлітасна выганяцца з нашых партыйных і комсамольскіх шэрагаў.

Здавалася-б няма чаго тут паўтараць усім вядомыя ўжо стаўшыя будзённымі фразы аб тым, што сусьветная буржуазія рыхтуе супроць СССР паход.

Таварышы,

у гіганцкай рабоце па будаўніцтву соцыялізму у натуральна захапляючым нас энтузіязме гэтай будоўлі, будучы марксістамі, людзьмі справы, а не захапленьня, людзьмі, якія не забываюцца аб барацьбе цалкам, мы ня маем права ўпускаць з віду хоць на міг пагражаючую нам з-за межаў небясьпеку.

Я хачу прыпомніць вам пару вытрымак з новай працы аднаго з вышэйшых кіраўнікоў нямецкай арміі ў сусьветную вайну, вядомага генэрала Людэндорфа. Гэты генэрал у свой час напрараказаў аб хуткім выхадзе імпэрыялістычнае вайны. Цяпер ён зноў заяўляе аб непасрэдна надыходзячай пагрозе новай сусьветнай вайны.

З якога-б пункту погляду ні разважаў Людэндорф, што ў яго намётках няма натуральных разыходжаньняў з тымі імпэрыялістычнымі плянамі, якія нядаўна разгарнуліся перад намі на працэсе „дзеячоў" „прампартыі". Людэндорф пісаў сваю кнігу безумоўна з тым, каб папярэдзіць нас аб блізкай інтэрвэнцыі, яго мэта—зьвесьці рахункі з палітычнымі ворагамі, абяцаць свой урад за ўсякага роду, з яго пункту погляду, і г. д. Але гэта не мяняе становішча.

У сьвятле перапляценьня з сусьветным экономічным крызісам міжнародных абставін апошніх год, у сьвятле шалёных антысавецкіх кампаній, усё больш злосна і пасьлядоўна праводзімых імпэрыялістымі ўсіх масьцей, кампаній, якія базуюцца на байцы, што „Чырвоная Маска" зьяўляецца крыніцай усіх, літаральна ўсіх бед сучаснай „цывілізаванай" грамады.

Я глыбока пераконаны,

што кожны з нас бяз усякіх хістаньняў выкажа жаданьне і гатоўнасьць узяць вінтоўку, альбо пайсьці да кулямёта самаахвярна абараняць сваю соцыялістычную бацькаўшчыну, калі на яго нападуць ворагі. Я ў гэтым ні на адну сэкунду не сумняваюся. Але гэтай гатоўнасьці—узяць стрэльбу, пайсьці да гарматы, альбо танка—ужо недаволі. Вайна ў сучасных умовах натрабуе агромнае колькасьці машын, прычым машын рознага прызначэньня, розных назваў і агромністай тэхнічнай складанасьці. Вайна мэханізуецца, машынізуецца, індустрыялізуецца ператвараючыся тым самым у агромністую вельмі складаную фабрыку зьнішчэньня людзей. Так вось на гэтай фабрыцы, у гэтай мэханізаванай вайне, якое мы ня хочам, супроць якое змагаемся, але якую супроць нас рыхтуюць, патрабуюцца кваліфікаваныя мэханікі, тэхнікі, патрабуюцца людзі, гатовыя ня толькі паміраць, але ўмеючыя правільна абыходзіцца з кожным вінцікам гэтай вельмі грознай і далёка няпрыемнай ваеннай машыны. І нам да гэтай справы неабходна рыхтавацца па-сапраўднаму.

Нападу на нас мы абавязаны супроцьставіць нашу жалезную, высока абучаную, політычна стойкую, добра ўзброеную бальшавіцкую армію. Комсамол ёсьць натуральны рэзэрв гэтай арміі.

Калі прыняць пад увагу, што будучая вайна будзе мэханізавана да апошніх граніц, што машыне ў гэтай вайне будзе ў значнай меры належаць адна з важнейшых і рашаючых ролей, стане зусім відавочным, што вынік барацьбы будзе ў значнай меры залежыць ад уменьня найбольш продукцыйна выкарыстаць гэтую машыну. Адсюль выцякае неабходнасьць асабліва востра ў даны момант паставіць пытаньне аб вылучэньні з свайго асяродзьдзя і адпаведнай падрыхтоўцы патрэбных нам ваенна-тэхнічных кадраў. Вось куды павінна быць накіравана наша ўвага ў першую чаргу. Вы маеце права мяне запытаць: „А як стаіць гэта справа зараз з Чырвонай арміяй?" Калі ў двух словах адказаць на гэтае пытаньне, дык я павінен сказаць, што ў значнай меры дзякуючы 200-тысячнаму комсамольскаму масыву ўнутры арміі, які самаахвярна і не пакладаючы рук працуе над удасканальваньнем узброеных сіл, мы ў сучасны момант у гэтых адносінах адчуваем сябе моцна, стаім на сваіх нагах даволі цьвёрда і ўпэўнена.

Раней за ўсё

вы павінны будзеце комплектаваць усе нашы ваенныя школы, і ў асаблівасьці школы паветранага і марскага флёту, бронетанкавыя і ўсё тэхнічныя школы ў асноўным цалкам з свайго асяродзьдзя і несьці адказнасьць за работу і вучобу іх пераменнага складу. Як гэтая справа з комплектаваньнем ваенных стаяла дагэтуль? Дрэннавата.

Комплектаваньне ваенных школ і часткова акадэмій лепшымі членамі гэройскага і чырвонаштандартнага ленінскага комсамолу,—вось ваша першая і асноўная, з майго пункту погляду, задача.

Далей вы павінны будзеце ўзяць на сябе абавязацельства і ў далейшым падтрымліваць цесную сувязь з нашым Чырвоным морскім флётам, у асабістым складзе якога агромністы процант комсамольцаў.

У сучасны момант становішча ў морскім флёце з пункту погляду асабістага складу зусім добрае. Але ўсё ж такі, неабходна мець на ўвазе, што ў момант мобілізацыі, у момант разгортваньня марскіх сіл, на плечы нашага саюзу ляжа агромністая адказная задача ўкомплектаваньня морскага флёту да памераў ваеннага часу.

У адносінах паветранага флёту мы маем значныя перавагі ў параўнаньні з іншымі родамі войск. Паветраныя сілы мы пачалі занава будаваць і будуем на аснове дасягненьняў сусьветнай тэхнікі. Прычым будуем са значнымі посьпехамі. Але баяздольнасьць паветранага флёту ў шмат чым залежыць ад асабістага яго складу. Ад таго, хто будзе абслугоўваць нашы паветраныя сілы ў якасьці лётнікаў, бортмаханікаў, у якасьці інжынэраў, работнікаў аэрадромаў—ад гэтага ў значнай меры будуць залежаць і рост і посьпехі нашага Чырвонага паветранага флёту.

Таму вы абавязаны

ўзяць на сябе шэфства над ваенна-паветранымі сіламі. Шэфства гэта павінна выявіцца ў першую чаргу ў комплектаваньні ВПФ жывой чалавечай сілай, загадзя падрыхтаванай і політычна і культурна.

Я ня стану патрабаваць ад вас, каб вы цяпер жа ўзялі на сябе шэфства і над нашымі бронетанкавымі часьцямі. Але я прадбачу, што і гэтая „чаша" ня міне вас. Комплектаваньне бронетанкавых часьцей, а ня толькі школ, зноў такі прыдзецца ў значнай долі ўзваліць на плечы комсамолу, гэта-то ён вытрымае.

Я не магу паскардзіцца на работу комсамольцаў у Чырвонай арміі. Яе, як я ўжо гаварыў, калі нельга назваць бліскучай, дык ва ўсякім выпадку, яна ня горшая, чым у іншых галінах нашай дзяржавы, я павінен асабліва падкрэсьліць, што і ўзброеныя сілы СССР, як і ўсе галіны нашай соцыялістычнай будоўлі, з кожным годам удасканальваюцца.

Комсамольцам, разам з партыйнай організацыяй, неабходна загадзя падумаць і напружана працаваць, каб не адстаць ад тых патрабаваньняў, якія да іх прад'яўляе вырасшая Чырвоная армія. Таму і ў будучым вам трэба накіроўваць работу комсамольскай організацыі ў арміі такім чынам, каб заўжды і на ўсіх этапах быць верными карысным дапаможнікам нашых партыйных організацый і нашага камандаваньня ў справе згрупаваньня тэхнічнага і політычнага ўмацаваньня і баявой падрыхтоўкі часьцей.

Будучая вайна,

як сказана вышэй, будзе вайною машын. Як і ва ўсякай вайне, у будучай вайне будуць дзейнічаць два асноўныя фактары: машына і чалавек. Пэўнае ўяўленьне аб ролі тэхнічных сродкаў барацьбы ў будучай вайне дае імпэрыялістычная вайна, быўшая ўжо ў значнай ступені вайной машын, у асаблівасьці к яе канцу—к 1917 і 1918 г. г.

Вайна патрабуе колёсальнага напружаньня гаспадаркі ўсіх дзяржаў. На вайну будзе мобілізавана і цяжкая і лёгкая і сярэдняя індустрыя. Мэталюргія, хэмія, электрычнасьць радыё і інш. лябораторыі, навуковыя інстытуты, усё гэта будзе мобілізавана на вайну, усё гэта будзе пастаўлена на служэньне ёй. І нам з вамі таксама неабходна, разважаючы аб вайне, помніць, што мы будзем абараняцца ня толькі ўзброенай арміяй, мы адначасова будзем ваяваць і нашай прамысловасьцю і нашымі машынамі і нашымі лябараторыямі і нашымі інстытутамі.

І калі вы гаворыце аб якасьці, вы павінны ўдумацца ў гэтае слова па-сапраўднаму. Нам патрэбна сапраўды добрая якасьць нашай работы наогул, добрая якасьць нашай продукцыі ў прыватнасьці, прычым не калі небудзь і ня як-небудзь, а безадкладна, у гэтую-ж хвіліну, бо вайна можа разразіцца ў любы час.

Вайну рыхтуюць супроць нас яны, а ня мы супроць іх. Напад ўтвораць яны, а ня мы. Значыцца, якасьць работы, якасьць нашых вырабаў у абароне краіны будзе адыгрываць найважнейшую ролю. Мы павінны яшчэ больш забясьпечыць армію ўсімі неабходнымі сучаснымі сродкамі, якія-б не ўступалі па якасьці зброі нашых праціўнікаў.

Як стаіць справа ў нас з якасьцю продукцыі? Я маю на ўвазе толькі якасьць той продукцыі, з якою мне прыходзіцца мець справу. Мы дасягнулі ўжо агромністых посьпехаў у галіне прамысловай продукцыі, але якасьць патрабуе к сабе сур'ёзнай увагі. Вам маладым бальшавікам, вам застрэльшчыкам соцспаборніцтва і ўдарніцтва трэба нажаць на якасьць з усім комсамольскім запалам і сілай. Мы абавязаны абараняцца ад нападу зброяй ня горшай, а лепшай, чым у нападаючага ворага. Так яно і будзе, трэба толькі гэтага захацець. А комсамольцы ня могуць не жадаць па-сапраўднаму, па бальшавіцку абараняць сваю соцыялістычную бацькаўшчыну.

Якасьць продукцыі на

заводах, на фабрыках, ва ўсіх нашых інстытутах і лябараторыях, якасьць усёй нашай работы павінна быць адным з важнейшых пытаньняў нашай дзейнасьці. Я пераконаны, што комсамол—організацыя маладых ленінцаў, натхнёная ідэямі нашай партыі—ўяўляе сабою такую сілу, якая здольна мобілізавацца вакол гэтых пытаньняў і вырашыць іх зараз-жа.

У нас ёсьць паказчыкі якасьці, якім пазайздросьціць усякі. Якасьць нашай організацыі, ня толькі партыйнай, а і комсамольскай выключная! Такіх організацый ня бачыў і ня ведаў сьвет. А калі так, дык мы можам і у іншых кірунках дабіцца неабходных якасных паказчыкаў. І таму я прашу вас удзяліць на зьезьдзе і ў практычнай вашай рабоце пытаньню якасьці выключную ўвагу і над ім прызадумацца.

Мой абавязак яшчэ раз напомніць вам, што пытаньні абароны дзяржавы ва ўсёй грандыёзнай нашай гістарычнай рабоце зьяўляюцца важнейшымі вузлавымі пытаньнямі. Загружаныя да адказу штодзённымі клопатамі, конкрэтна ня бачачы вайны, аб якой мы гаворым на працягу 10 год, мы скрозь і ўсюды абмяжоўваемся толькі гутаркамі аб абароне, ды і то ва ўрачыстых выпадках.

Хачу, каб ад гэтага IX зьезду ў асяродзьдзі комсамолу наступіў сапраўдны пералом, каб комсамол заняўся-б пытаньнямі абароны па-сапраўднаму, па-ленінску. Жадаю вам, таварышы, знайсьці ў сабе сілы, ленінскую настойлівасьць, энэргію вырашыць гэтыя важнейшыя пытаньні, як колькасна, так і асабліва ў якасных адносінах.

Ня ай жыве ленінскі комсамол! (Бурныя воплескі ўсяе залі. Усе ўстаюць. Крыкі „ура!").

5-ая конфэрэнцыя КСМ Н-дывізіі

ЗА БАЛЬШАВІЦКІЯ ТЭМПЫ

ва ўзмацненьні баявой і політычнай падрыхтоўкі дывізіі

Закончылася пятая дывізіённая комсамольская конфэрэнцыя Н-ударнай Самарскай дывізіі. Конфэрэнцыя прайшла пад знакам беззаветнай адданасьці выпрабаванаму бальшавіцкаму кіраўніцтву партыі Леніна, пад знакам рашучай барацьбы з опортунізмам і ўхіламі ўсіх масьцей, за генэральную лінію партыі, за клясавую і ідэолёгічную чыстату ленінскага комсамолу, пад знакам рашэньняў IX і X зьездаў ЛКСМ, за бальшавіцкія тэмпы ў справе ўмацаваньня баявой і політычнай падрыхтоўкі дывізіі.

Стройнымі згуртаванымі калёнамі перад конфэрэнцыяй прашлі дэлегацыі ўсіх частак дывізіі. У падарунак 5-й дывізіённай комсамольскай конфэрэнцыі часткі дывізіі папоўнілі свае шэрагі новымі атрадамі лепшых байцоў-ударнікаў з рабочых-батракоў і колгасьнікаў.

Астраханскі полк перадаў у комсамол 65 чалавек, Стаўропальскі полк 29 чалавек, Тэрскі—67 чал., Фрунзэўскі—87 чал. Броньдывізіён—36 чал.

Комсамольцы-фрунзэўцы перадалі 37 чал. лепшых комсамольцаў у шэрагі партыі, 26 малодшых камандзіраў замацавалі сябе на звышслужбе да канца пяцігодкі.

Комсамольская організацыя Астраханскага палка сабрала 386 арапаноў, з якіх 261 на сёньняшні дзень рэалізаваны. К 50-годзьдзю Варашылава 62 комсамольцы Астраханскага палка абвясьцілі сябе энтузіястымі „варашылаўцамі". На палкавым комсамольскім сходзе сабрана 400 рублёў на пабудову дырыжабля „Клім Варашылаў". Стаўропальскі полк па ініцыятыве комсамольскай організацыі сабраў 120 прапаноў і выклікаў на спаборніцтва па іх пасьпяховай рэалізацыі палкавую школу, абвясьціўшы сябе цалкам ударным палком імя Кліма Варашылава.

У асобым эскадроне сувязі кавпалка комсамольцы далі 108 каштоўных прапаноў, з якіх частка на сёньняшні дзень рэалізавана. Побач з дасягненьнямі ў рабоце комсамольскай організацыі ў справе павышэньня баявой і політычнай работы, камсамольцы-дэлегаты з усёй рашучасьцю асудзілі выпадкі неахайных адносін да зброі, каня і г. д. Таксама мае недахопы работа комсамольскай ячэйкі па нацыянальна-культурнаму будаўніцтву.

Слабое месца комсамольскай організацыі—ваенкораўская работа. Ня ўсе яшчэ комсамольцы ператварылі ў жыцьцё лёзунг: „Кожны ваенкор-ударнік, кожны ўдарнік-ваенкор".

Конфэрэнцыя паслала прывітальныя тэлеграмы тав. Сталіну, Варашылаву і „Чырвонаармейскай Праўдзе".

Ваенкораўская брыгада Н-ай дывізіі Фраер, Шапіра

Выклікаем на соцспаборніцтва

Комсамольская ячэйка Гарсавету амаль нічога не рабіла па шэфству над Чырвонай арміяй. Вайсковая праца ў ячэйцы была ў заняпадзе. У сувязі з рашэньнямі зьезду комсамолу, ячэйка начала сыстэматычна праводзіць вайсковыя заняткі, абавязаўшы усіх комсамольцаў наведваць іх. Заняткі гуртка пастаноўлена праводзіць, заместа двух разоў,—тры разы ў месяц, уключаючы знаёмства з гісторыяй Чырвонай арміі.

На сходзе, прысьвечаным 50-годзьдзю Варашылава, ячэйка ЛКСМБ ўнесла на пабудову дырыжабля „Клім Варашылаў" 20 рублёў, выклікаўшы на соц. спаборніцтва як па вайсковай працы, так і па ўнясеньні сродкаў ячэйкі Абкомтрасту трамвайнага парку.

З. Гальперын.

СТВАРЭНЬНЕМ ВАРАШЫЛАЎСКІХ УДАРНЫХ БРЫГАД

рабочыя, чырвонаармейцы і колгасьнікі адзначаюць слаўны юбілей бальшавіка-ленінца

Цьвёрдакаменнаму бальшавіку-ленінцу прывітаньне

Прэзыдыум ЦВК Беларусі горача вітае Вас, дарагі тав. Варашылаў, як цьвёрдакаменнага бальшавіка-ленінца, з прычыны Вашага 50-годзьдзя.

Слаўны шлях рэволюцыйнай барацьбы Вашай у шэрагах бальшавікоў за перамогу пролетарскай рэволюцыі непарыўна зьвязаны з гісторыяй утварэньня, узмацненьня і перамог Чырвонай Армії, прызнаным правадыром якое Вы зьяўляецеся.

ЦВК БССР, ад імя рабочае клясы і ўсіх працоўных Савецкай Беларусі, ва ўрачысты дзень Вашага 50-гадовага юбілею дае цьвёрдае запэўненьне, вядучы непахісна барацьбу за перамогу соцыялізму на аснове генэральнай лініі партыі, мацаваць пад Вашым непасрэдным кіраўніцтвам боездольнасьць савецкай краіны і боездольнасьць Чырвонай арміі, каб своечасова адбіць усякую спробу імпэрыялістычнай інтэрвэнцыі і забясьпечыць перамогу соцыялізму ў СССР і ва ўсім сьвеце.

Няхай жыве комуністычная партыя—правадыр і авангард усіх працоўных у барацьбе за соцыялізм!

Няхай жыве ленінскі цэнтральны камітэт УсеКП(б) і яго прызнаны правадыр тав. Сталін!

Няхай жыве цьвёрдакаменны бальшавік—ленінец—правадыр Чырвонай арміі Клім Варашылаў.

Старшыня ЦВК БССР—Чарвякоў
Сакратар ЦВК БССР—Хацкевіч

Шматлікія прывітаньні з усіх канцоў СССР

МАСКВА, 3.—Са ўсіх канцоў Савецкага Саюзу ўвесь час паступаюць шматлікія прывітаньні на імя наркомваенмора К. Е. Варашылава зьвязку з яго 50-цігодзьдзем.

***

КІЕЎ, 3.—Лятучыя мітынгі і сходы чырвонаармейцаў і камскладу хадайнічаюць перад урадам аб узнагародзе тав. Варашылава ордэнам чырвонай зоркі. На будаўніцтва дырыжабля "Клім Варашылаў" часьцях гарнізону сабрана 12 тыс. руб.

***

З прывітаньнем да тав. Варашылава зьвярнулася таксама Ўсесаюзная нарада дырэктароў саўгасаў зборжатрэсту.

—Большасьць удзельнікаў нашай нарады,—гаворыцца ў прывітаньні,—удзельнікі грамадзянскай вайны, пад тваім кіраўніцтвам перамогшыя са зброяй у руках сваё права будаваць соцыялізм і пеадолеўшыя капіталістычнаму сьвету магутныя соцыялістычныя мэханізаваныя збожжавыя фабрыкі.

Мы ня толькі забясьпечваем соцыялістычнае будаўніцтва ў бягучым годзе 160 млн. пуд. таварнага збожжа, але і рыхтуем у сваіх збожжасаўгасах трактарыстых і шофэраў, якія гатовы разам з намі ў любы момант зьмяніць руль трактара на руль танка і пад тваім камандаваньнем адбіць усе спробы ворагаў рабочай клясы, перашкодзіць нам будаваць і пабудаваць соцыялізм.

„Энэргаўцы„ у дзень юбілею Варашылава

Гудзе гудок. Доўгі... працяжны.

Гудок кліча... На мітынг! 50 год Кліму Варашылаву, 50 год правадыру Чырвонай арміі, 50 год сталёваму бальшавіку.

У адзнаку юбілею правадыра расьце ўдарны рух.

„Энэргаўцы" у дзень юбілею ўтварылі вытворча-бытавую комсамольскую комуну. Увесь завод ухваліў—чатыры гадзіны ўдарнай працы на пабудову дырыжабля "Клім Варашылаў".

У такарным, сьлясарным, кавальным стварылі брыгады якасьці, брыгады ў бой з бракам імя Кліма Варашылава. Варашылаўцы вытворчасьці вышлі у бой за якасьць.

Паўловіч—рабочы заводу „Энэргія", сьлесар, у адзнаку юбілея сьлесара Варашылава адпрацоўвае два дні на пабудову дырыжабля „Клім Варашылаў". Паўловіч—сын, комсамолец, па прыкладу бацькі таксама адпрацоўвае два дні.

„Чырвоны Молат"—газэта „энэргаўцаў" выдае нумар „Клім Варашылаў„.

Да юбілею правадыра—вышэй тэмпы і якасьць баявой падрыхтоўкі

Комсамолія №-га палка да юбілею правадыра ўтварыла скразную комсамольскую палкавую брыгаду, тры батальённыя ўдарныя брыгады. Комсамольская ячэйка правяла шэсьць ударных варт, якія паказалі ўзор нясеньня службы на варце і атрымалі падзяку ад гарнізоннага і палкавога камандаваньня ў загадзе па палку. К юбілею ахоплена індывідуальным ударніцтвам і соц. спаборніцтвам 100 проц. комсамольцаў-байцоў.

З 1 па 10 лютага абвешчаны ўдарны варашылаўскі дзесяцідзёньнік за чыстую вінтоўку, за тэхнічныя веды.

Сянкевіч

Юбілей Варашылава—юбілей Чырвонай арміі

ЦК Компартыі Нямеччыны прыслаў наступную прывітальную тэлеграму тав. ВАРАШЫЛАВУ:

„Ад імя мільёнаў нямецкіх рэволюцыйных рабочых і працоўных Цэнтральны Камітэт КПН шле табе бальшавіцкаму правадыру Чырвонай арміі, гарачае брацкае баявое прывітаньне да твайго 50-цігодзьдзя. Многія мільёны нямецкіх рабочых з вялікім уздымам глядзяць на ажыцьцяўленьне соцыялізму ў Савецкім Саюзе. Моцна зьвязаны яны з чырвонай рабоча-сялянскай арміяй—вартавым соцыялістычнага будаўніцтва. інтэрнацыянальнай арміяй сусьветнага соцыялізму.

Тав. Варашылаў твой сёньняшні юбілей—гэта юбілей Чырвонай арміі, шлях якой, пачынаючы з Кастрычніцкай чырвонай гвардыі і канчаючы магутнай Чырвонай арміяй, як арміяй міру і баявой абароны соцыялістычнага будаўніцтва, непарыўна зьвязан у гісторыі з тваім імем. Наша прывітаньне адносіцца адначасова і да носьбіта пераможнай бальшавіцкай генэральнай лініі—компартыі Савецкага Саюзу, да політбюро якой належыш і ты. Мы вітаем цябе прывітаньнем нямецкага рэволюцыйнага пролетарыяту, словамі "Чырвоны фронт" і пацьвярджаем тым самым нашу рашучую гатоўнасьць усімі сродкамі абараняць соцыялістычную савецкую краіну супроць яе імпэрыялістычных, фашысцкіх і соцыял-фашысцкіх ворагаў.

Наркомваенмору і старшыні Рэвваенсавету СССР тав. Варашылаву

Вернаму насьледавальніку Леніна, прадстаўніку старое бальшавіцкае гвардыі, правадыру і організатару ўзброеных сіл пролетарскай дыктатуры—Клімэнту Яфрэмавічу Варашылаву ад імя партыйных організацый, байцоў і начскладу акругі-шчырае баявое прывітаньне.

50-ці годзьдзе любімага правадыра Чырвонай арміі ўздымае новую хвалю соцыялістычнага энтузіязму байцоў і начскладу ў справе выкананьня загаду Наркома аб баявой падрыхтоўцы.

Знаходзячыся на варце заходняй мяжы краіны Саветаў, войскі акругі, у цесным яднаньні з працоўнымі БССР, Заходняй вобласьці і ўсяго Саюзу, гатовы ў любы момант адбіць напад імпэрыялістых і змагацца за краіну, якая ўступіла ў пэрыод соцыялізму, змагацца „з усім уласьцівым нам запалам, з усёю жорсткаю сілай 150 мільёнаў вольных народаў".

Рэвваенсавет Б.В.А.

Ператвараем словы ў справы

Ячэйка ЛКСМБ малога рамонту вагонаў разгарнула вайсковую працу. На сходзе ячэйкі, прысьвечаным 50-годзьдзю Варашылава, чырвонаармеец—шэфы зрабілі даклад аб дзейнасьці і заслугах Кліма Варашылава, аб небясьпецы будучай вайны і ролі комсамолу ў ёй. Пасьля дакладу ячэйка абвясьціла сябе мобілізаванай на пасьпяховае вывучэньне вайсковых ведаў. Зараз ячэйка разьбілася на дзьве групы і распачала працу па вывучэньню стрэльбы і гісторыі Чырвонай арміі.

Акрамя гэтага сабрана звыш 70 рублёў на дырыжаблябудаўніцтва.

Ячэйка выклікала на соц. спаборніцтва астатнія ячэйкі чыгункі на лепшае правядзеньне вайсковых занятнаў, збор сродкаў

Піонэратрад, разам з комсамольскай ячэйкай, вывучае вайсковую справу, адначасова разгарнуўшы працу па збору сродкаў на пабудову дырыжабля „Клім Варашылаў".

Ласкевіч

Клімэнт Яфрэмавіч Варашылаў у шэрагах конарміі

(З нарысаў да гісторыі 1-й Коннай Арміі)

Спаўняецца 50 год са дня нараджэньня кіраўніка Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі падпольшчыка-рэволюцыянэра, выпрабаванага бальшавіка-ленінца луганскага сьлесара і Наркома—Клімэнта Яфрэмавіча Варашылава.

Я ня зьбіраюся і ня маю магчымасьці даць якую-небудзь вычэрпваючую характарыстыку тав. Варашылаву. Спынюся толькі на тых ураджаньнях, якія засталіся ў мяне ад першых спатканьняў з Клімэнтам Яфрэмавічам і ад пасьлядоўнай іх працы й работы на франтох грамадзянскай вайны.

Першае маё спатканьне з Клімэнтам Яфрэмавічам адбылося пры самым зараджэньні нашай коньніцы. Было лета 1918 году. На ст. Рамонтная зьбіраліся атрады Сальскай акругі, выходзіўшыя к Царыцыну. У гэты пролетарскі цэнтр ўжо сьцягнуліся баявыя сілы, адыходзіўшыя ад Украіны і Донбасу. Стварылася Х Чырвоная армія на чале з тав. Варашылавым і ўжо намячаліся абрысы тэй жорсткай барацьбы, якую данская казачая контр-рэволюцыя павяла супроць гэтага стратэгічна і палітычна важнага пункта. Сюды сьцягнуліся ўсе рэволюцыйныя атрады і атрадзікі, самастойна дзейнічаўшыя на Доне і ў Стаўропалі.

Зьяўленьне ў такіх умовах сярод партызанскіх атрадаў тав. Варашылава мела вялікае політычнае значэньне. Я ў той час непасрэдна кіраваў кавалерыйскім дывізіёнам, які быў сформаваны з большасьці сальскіх кав. атрадаў і зьяўляўся самай буйнай кавалерыйскай часткай. З гэтага кав. дывізіёну ў далейшым разгарнуліся полк, брыгада і дывізія стаўшыя ядром 1-й Коннай Арміі.

Пазнаёміўшыся з тав. Варашылавым, па расіў яго выступіць перад усім кав. дывізіёнам.

Простая, але гарачая і пераканаўчая прамова, выразна якая політычныя лёзунгі,—за што мы змагаемся і што нам трэба зрабіць, каб перамагчы,—зрабілі глыбокае ўражаньне на чырвоных партызан, ускрыўшы перад намі клясавую сутнасьць жорсткай барацьбы з ворагам. Гэта была для нас першая бальшавіцкая прамова буйнога політычнага работніка-комуніста.


Другое спатканьне маё з Варашылавым адбылося пазьней. Наступіла памятная восень 1918 году. Красноўскія казачыя войскі цесным колам аблягалі Царыцын.

Гэроічная ўпартая абарона чырвоных царыцынскіх войск мела істотнейшы недахоп, менавіта—абарона насіла выключна пасыўны характар. Казачая дывізія, вольна манэўруючы ўздоўж фронту, дзень за днём наносіла нам сконцэнтраваныя ўдары ў найбольш адчувальныя месцы. Урэшце няякая ўпартасьць абароны не змагла-б вытрымаць гэтых настойлівых удараў, і мажлівасьць рашучага і нечаканага прарыву, а адсюль катастрофа станавілася рэальнасьцю. Неабходна было ў корані зьмяніць мэтоды абароны. Камандаваньне на чале з тав. Варашылавым надзвычайна добра разумела пагрозу і прымала гэроічныя меры, каб раскачаць часьці і асабліва іх камандзіраў, якія з цяжкасьцю згаджаліся на неабходнасьць пераходу да актыўных мэтодаў барацьбы.

У такіх абставінах адбылося другое маё спатканьне з тав. Варашылавым як камандзірам.

Наша коньніца размяшчалася на адлеглым левым флянгу Царыцынскага фронту, побач з 37 стр. дывізіяй. Штаб коньніцы і 37 стр. дывізіі стаялі на ст. Абганерава.

У адзін з шэрых і бязьдзейных дзён, узяўшы чалавек 25 кавалеры тых я накіраваўся ў разьведку. Забраўшыся глыбока ў тыл праціўніка я ўстанавіў супроць нашай дывізіі Астраханскую пяхотную дывізію белых, а на самым крайнім іх флянгу кавалерыйскую групу, сілаю каля трох палкоў. Праціўнік, упэўніўшыся ў нашай пасыўнасьці, праяўляў і сам значную бясьпечнасьць. Даведаўшыся дакладна аб яго разьмяшчэньні, я прышоў да цьвёрдага пераконаньня ў магчымасьці поўнага разгрому Астраханскай дывізіі. У мяне насьпеў і выявіўся з поўнай яскравасьцю плян гэтай опэрацыі. З абытымі весткамі і плянам я пасьпяшыў на станцыю Абганерава, каб уламаць Думенка і Шоўкаплясава



Т.т. БУДЗЁНЫ, ФРУНЗЭ і ВАРАШЫЛАЎ на паўднёвым фронце

прыняць мой плян дзеяньняў. На кватэры ў Думенка я застаў Шоўкаплясава і тав. Варашылава.

Прывітаўшыся і сеўшы з боку, я прыслухаўся да гутаркі. К свайму глыбокаму зьдзіўленьню, я вусначу тав. Варашылава я пачуў дасканалае асьвятленьне склаўшагася ў мяне пляну і прапанову прынячць яго да выкананьня. З боку Думенка і Шоўкаплясава пасьпалі ся катэгорычныя супярэчаньні—моў, гэта нам не пад сілу, што гэта можа пагражаць на катастрофай і г. д. Я ня вытрымаў, папрасіў слова ў тав. Варашылава і паведаміў яму аб выніках сваё разьведкі і аб склаўшымся ў мяне пляне.

Камандзір арміяй, відаць, быў абрадаваны падтрыманьем:—„Ну, што вы на гэта скажаце? Вось чалавек, якога я ня ведаю, з якім я ня змаўляўся, а думкі ў нас зусім аднолькавыя. Справа ясная, тарчаць на адным месцы немагчыма. Кончым гутаркі, давайце прыступайце да справы..." План камандарма быў прыняты.

Раніцою наша коньніца, а потым, у загадзя прызначаны час, і пяхота перайшлі ў наступленьне. Конная група праціўніка нечаканым налётам была зьнята і расьсеяна. Глыбокім абходам наша коньніца вышла ў тыл астраханцам, зьвязаным з фронтам нашай пяхоты. Дывізія белых з усёй зброяй і абозамі была ўзята ў палон. Вялікі ўчастак фронту быў ачышчаны ад белых войск, прымусіўшы іх асабіць вацiск на іншыя ўчасткі.

Восеньню 1919 году перад РВС паўднёвага фронту ў асобе т.в. Сталіна і Ягорава з надзвычайнай відочнасьцю паўстала неабходнасьць стварыць буйную конную адзінку, без якое нельга было хутка і рашуча разьбіць Дзянікіна, асноўную сілу якога склала яго коньніца. К тэтаму часу ў складзе сіл паўднёвага фронту па сваіх баявых якасьцях набыў гучную вядомасьць 1 конны корпус, які нарадзіўся і вырас у шэрагах 10 Чырвонай арміі, пры актыўным удзеле тав. Варашылава, як камандарма, і т. Сталіна, як члена РВС.

1 сьнежня 1919 г. т. Варашылаў прыбыў у конную армію. Тысячны масы калён 4 кавалерыйскай дывізіі на парадзе ў сяле Вялікая Міхайлаўка, па мойму, зрабілі на яго вагромністае ўражаньне. Тым больш натхнёна гучэла прамова яго на мітынгу сярод тысяч конных байцоў, над шэрагамі якіх рэялі чырвоныя сьцягі, абвеяныя славай многіх пераможных боек.

Ва ўсіх далейшых опэрацыях коннай арміі па сутнасьці ня было ніводнага больш ці менш сур'ёзнага бою, дзе-б мы з т. Варашылавым ня прысутнічалі і ня кіравалі.

Павінен прызнацца, што мне, маючаму за плячыма даволі баявога вопыту рэдка прыходзілася бачыць людзей, якія-б мелі столькі бясстрашнасьці і выключнай асабістай храбрасьці, як т. Варашылаў.

У Клімэнта Яфрэмавіча была яркая любоў да байцоў, да камандзіраў. Варта бывала, з явіцца камандзірам,—гэтым байцам, пракаленым ад сьпёкі, ветрамі і порахам нясупынных боек, як для яго цэлае сьвята.

У сваім нарысе я хацеў падзяліцца з чытачамі тымі ўражаньнямі, якія склаліся у мяне аб ім, як аб баявым сапраўдніку, а ня-політычным працаўніку, імя якога непарыўна зьвязана з гісторыяй першай коннай арміі і нарэшце, як аб дасканалым таварышу і чалавеку ў шырокім сэнсе гэтага слову.

У дзень 50-годзьдзя нашага любімага і дарагога Клімэнта Яфрэмавіча пажадаем яму здароўя і сіл для далейшай працы па ўмацаваньню абароны нашага Саюзу, на пасту кіраўніка Рабоча-сялянскай Чырвонай арміі.

С. Будзённы.

НА ВАРЦЕ КРАІНЫ САВЕТАЎ АД НАПАДУ ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНЫХ ДРАПЕЖНІКА

Даючы сродкі ў фонд абароны узмацнім абароназдольнасьць краіны савета

Над краінай саветаў будуць рэяць савецкія дырыжаблі

Капіталістыя, якіх душаць ціскі глыбокага крызысу, ліхаманкава ўзброўваюцца, лічачы шляхам вайны з СССР выйсьцем з крызісу. Асыгнаваньні на ваенныя патрэбы з кожным днём павялічваюцца. Францыя са шчодрасьцю бесшабашнага гулякі раздае мільёны франкаў з сваіх залатых склепаў для ўзбраеньня Польшчы, Румыніі, Чэха-Славакіі...

— За пяць апошніх год ваенныя паветраныя флёты ў буйнейшых капіталістычных дзяржавах больш чым падвоіліся.

Ваеннае міністэрства Амэрыкі зусім нядаўна здало заказ на 63 самалёты і 128 матораў для самалётаў на агульную суму 142 тыс. даляроў.

У Польшчы „грамадзянская“ авіяцыя фактычна зьяўляецца авіяцыяй ваеннай. „Грамадзянская“ авіяцыя толькі формальна знаходзіцца пад ведамам міністэрства шляхоў зносін, а сапраўды ўся праца яе вядзецца пад непасрэдным кіраўніцтвам ваеннага міністэрства.

Пасьля нядаўна заключанага ваеннага дагавору паміж Польшчай і Румыніяй, ў Варшаве была апублікавана румына-польская конвэнцыя з прычыны рэгулярных паветраных зносін паміж абодзьвюма дзяржавамі. У выніку гэтай „дружбы“ абсталявана новая лінія Львоў-Бухарэст.

З гэтага мы можам з ўпэўненасьцю заключыць, што капіталістыя, ліхаманкава ўзбройваючыся, удзеляюць вялікую ўвагу паветранаму флёту, а гэта значыць, што яны будуць нападаць зьверху. Мы павінны даць і бязумоўна дамо належны адпор імпэрыялістычным драпежнікам.

Нам трэба ўсяляк ўзмацняць абароназдольнасьць краіны. Мы павінны павялічваць колькасьць сталёвых птушак, якія дадуць адпор крывавым арлом імпэрыялістых.

Для таго, каб яшчэ больш узмацніць магутнасьць паветранага флёту, комсамол узяў над ім шэфства, г. зн. што „лёс ленінскага комсамолу непарыўна зьвязаны з лёсам ваенна-паветраных сіл РСЧА“.

Ленінскі комсамол ў час грамадзянскай вайны аддаў лепшыя свае сілы ў шэрагі Чырвонай арміі, за што заслужыў ордэн чырвонага сьцягу і зараз паказвае узоры працы па абароназдольнасьці краіны саветаў. Ужо на 22 студзеня на 1 толькі дырыжабль „Клім Варашылаў“ сума ўзносаў перавысіла мільён. Гэты факт гаворыць аб тым, што працоўныя Савецкага Саюзу, жыва і з вялікім энтузіязмам адгукнуўшыся на справу збору сродкаў, зразумелі і ацанілі значэньне дырыжаблябудаўніцтва ў СССР.

Мільён рублёў—вялікі скарб, укладзены ў будаўніцтва паветранага флёту, але гэта сума яшчэ недастатковая. Мільён рублёў—толькі адна пятая частка таго, што патрэбна для будаўніцтва дырыжабляў. Ці можам мы зараз ажыцьцёвіць настаўленую перад сабою задачу—пабудаваць дырыжаблі? Бязумоўна, вопыт паказаў, што дзякуючы вялікаму энтузіязму працоўных, гэта справа бясспрэчна, магчыма. Таму мы павінны дасягнуць намечанай мэты. Трэба толькі не спыніць працу па збору сродкаў, а наадварот,—узмацніць гэту працу. Трэба і надалей узмацніць фонд як дырыжаблябудаўніцтва, так і наогул паветранага флёту.

Лепшым падарункам правадыру—юбіляру тав. Варашылаву будзе, калі мы зьбярэм неабходныя для пабудовы дырыжабляў сродкі і заваюем новыя дасягненьні на фронце ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны.

Дырыжабль „Клім Варашылаў“ і іншыя дырыжблі сумесна з самалётамі павінны рэяць над краінай Саветаў. Яны будуць рэяць!

„Новыя дзесяткі і сотні самалётаў, пабудаваныя на грошы працоўных, комсамольцы-лётнікі і комсамол шэф ваенна-паветраных сіл РСЧА,—будзе лепшым адказам на падкопы Пуанкарэ, Пілсудзкіх і ўсіх імпэрыялістычных драпежнікаў“

Ажыцьцяўляем шэфства над паветраным флётам

Комсамольскі колектыў заводу „Комувар“ практычна пачаў ажыцьцяўляць шэфства над паветраным флётам.

К 50-гадаваму юбілею Варашылава, комсамольскі колектыў заводу правёў мітынгі рабочай моладзі, дзе абгаварыў шэраг практычных мерапрыемстваў па ажыцьцяўленьню шэфства над Чырвонай арміяй.


Праведзены, па ініцыятыве комсамольскага колектыву, гутаркі на ўсіх цэхах аб 50-годзьдзі Кліма Варашылава.

Колектыў ЛКСМБ узьняў пытаньне перад заводакіраўніцтвам аб правядзеньні агульна-заводзкага суботніку ў карысьць дырыжаблябудаўніцтва.

Падпіснымі лістамі на пабудову дырыжабля „Клім Варашылава“ сабрана 320 рублёў.

На заводзе вайсковая праца была ў дрэнным стане. Комсамольскі колектыў абгаварыў шэраг мерапрыемстваў аб яе палепшаньні, з такім разьлікам, каб дасягнуць комсамольскіх выездаў „аб 100 проц. ахопе комсамольцаў вайсковым навучаньнем“, быў выканаы.

Канонік



Курсанты чэрвеньскай вячэрняй школы рабочае моладзі ўносяць на пабудову дыржабля „КЛІМ ВАРАШЫЛАЎ“ 570 рублёў і выклікаюць пасьледваць іх прыкладу Чэрвеньскую комсамольскую школу СПШК і Пухавіцкую вячэрнюю школу моладзі.

Булат і Слаўковіч

* Ямінская ячэйка ЛКСМБ Любаньскага раёну, пры шырокім удзеле ўсёй працоўнай моладзі, правяла падпіску на дыржабль „КЛІМ ВАРАШЫЛАЎ“. Сабрана 49 рублёў.

Гурбо

* Колектыў ЛКСМБ, Слуцкага Белпэдтэхнікуму, адгукнуўшыся на выклік колектыву ЛКСМБ заводу „Бальшавік“, сабраў 400 рублёў на пабудову самалёту імя X зьезду ЛКСМБ.

Лучнік

* Ручанская ячэйка ЛКСМБ, Бялыніцкага РК ЛКСМБ выпусьціла на пабудову дыржабля падпісны ліст і сабрала 47 руб. 87 капеек. Выклікаем пасьледваць нашаму прыкладу ячэйку ЛКСМБ Аксеньхаўскую, Вядзерскую, Запольскую і Угольшчынскую таго-ж раёну.

Запольскі К.

Комсамольская ячэйка пры Полацкім лясным тэхнікуме ў дэкаду абароны абвясьціла сябе ўдарнай і з удзелам беспартыйнага студэнства сабрала 403 рублі на пабудову дыржабля „КЛІМ ВАРАШЫЛАЎ“.

Усе грошы здадзены райкому комсамолу.

А. Тайбель

Працоўная моладзь вёскі Адамава (Глускі раён) на сваіх сходах рашыла абвясьціць збор сродкаў на пабудову дыржабля імя ДПУ і тут, жа ў першы вечар было сабрана 25 руб. 30 кап. Працоўная моладзь нашай вёскі выклікае пасьледваць свайму прыкладу моладзь усяе Грэшчыны.

С. Голас

* У вёсцы Пухавічы (Жыткавіцкі раён) сабрана 68 руб. 30 кап на пабудову дыржабля „Колгасьнік“.

Дарожка

* Комсамольцы Караваеўскай ячэйкі КСМ, разам з піонэратрадам вёскі Караваева, наладзілі на вёсцы збор утыльсыравіны. З усёй вёскі сабрана 150 пудоў утыльсыравіны. Комсамольцы таксама наладзілі сумесна з піонэрамі суботнік у колгасе „Новы Шлях“ і ўсе сродкі аддаюць на пабудову дыржабля.

Піцюха

* Па ініцыятыве комсамольскай і партыйнай організацыі пры фізкультурным тэхнікуме г. Менску была разгорнута праца па пытаньню аб пабудове дыржабляў у Савецкім Саюзе. Студэнцтва з вялікім энтузіязмам адгукнулася і вынесла пастанову адлічыць з свай стыпэндыі 140 р. у фонд пабудовы дыржабля „КЛІМ ВАРАШЫЛАЎ“. Студэнства выклікае пасьледваць свайму прыкла[...] ўсе навучальныя ўстановы і [...] культурныя організацыі Беларус[...]

Я. Лабада

* Цэх'ячэйка базы БЖС п[ры] комсамольскім колектыве БЖС [...]сіць у жалезны фонд імя IX зьез[ду] УсеЛКСМ зробленыя на суботні[ку] 50 рублёў і выклікае пасьледа[ваць] гэтаму прыкладу другую цэх. ячэй[ку] БЖС і ячэйку КСМ будвучу Б[...] дзяржбуду.

Бюро ячэй[кі]

* Колгасьнікі колгасу імя Ва[ра]шылава, Дрысенскага раёну, ацан[іў]шы пабальшавіцку шалёную падр[ых]тоўку імпэрыялістых да вайны [з] СССР, рашыла організаваць ячэй[ку] Асоавіяхэму. У першы-ж дзень [у] ячэйку ўступіла 18 чалавек колга[сь]нікаў.

Асоавіяхэмаўцы колгасу імя Ва[ра]шылава абяцаюць уцягнуць у в[ы]вучаньне ваеннай справы вакольн[ую] масу працоўнага сялянства.

Замб[...]

Бабруйская комсомолія рыхтуецца да другой колгаснай вясны

У Бабруйскім раёне пачалася падрыхтоўчая работа да правядзеньня другой колгаснай вясны.

Райком комсамолу распрацаваў шэраг мерапрыемстваў па практычнаму ўдзелу вясковых ячэек у правядзеньні вясеньняй пасеўнай кампаніі.

Для практычнай дапамогі вясковым ячэйкам у падрыхтоўцы і правядзеньні вясеньняй сяўбы райком накіраваў брыгаду з 30-ці чал. комсамольскіх актывістых гораду.

Райком таксама мобілізуе 10 комсамольцаў для посылкі іх на сталую працу ў больш слабыя колгасы.

З м э т а й мобілізаваць Увагу комсамолу, прыняць актыўны ўдзел у пасьпяховым правядзеньні вясеньняга севу, у бліжэйшы час будзе праведзен агульны зьлёт усёй колгаснай і вясковай моладзі.

Ф Хазнаў

Расійскія белагвардзейцы „працуюць“ рука-ў-руку з хэймвэрам

ВЕНА. Клюб расійскіх белагвардзейскіх эмігрантаў у Вене „Очаг“ сумесна з венскім хэймвэрам наладзілі антысавецкі сход.

На сходзе выступіў белагвардзейскі япіскап, які заклікаў да ўзброенай інтэрвэнцыі супроць СССР.

Сход адправіў прывітальную тэлеграму папе рымскаму, выказваючы яму падзяку за выступленьне супроць бальшавізму.

Фашызацыя дзяржаўнага апарату ў Нямеччыне

БЭРЛІН. Згодна пастановы прускага ўраду, на чале якога стаіць соц-дэмократ Браун, ля гор. Золінгена (буйны прамысловы цэнтр) назначаны тэрмінам на дванаццаць год обэр-бургомістэр (галава мясцовага самакіраўніцтва).

Гэты першы выпадак цыктатарскага прызначэньня обэр-бургомістра ў Нямеччыне ярка характарызуе растучую фашызацыю дзяржаўнага апарату. Неабходна падкрэсьліць пры гэтым, што Золігенскі муніцыпалітэт два разы абраў ў обэр-бургомістры комуністычнага члена муніцыпалітэту.

Прускі ўрад адмяніў рашэньне муніцыпалітэту.

Тав. Макс Гельц у Менску



Заўчора ў Менск прыехаў з Масквы вядомы нямецкі рэволюцыянэр, комуністы, пісьменьнік, гэрой Ордэну Чырвонага Сьцягу—тав. Макс Гельц.

Тав. Гельц наведаў рэдакцыю „Зьвязды“, дзе ў гутарцы з работнікамі рэдакцыі цікавіўся політычна-гаспадарчым і культурным жыцьцём БССР.

Тав. Гельц мае намер выдаць некалькі сваіх твораў на беларускай мове.

Час. вык. абав. адк. рэдактара— С. АНІС[...]

Згублены

— Мэтрычны выпіс на імя Це[...]люка, выд. Караліскім РВК.

— Комсам. біл. за № 130118 імя Сушко Сяргея, выд. Талачынск[ім] АК КСМ.

— Комсам. біл. за № 97961. на [імя] Шаевіча Я. Ю., выд. Мазырскім [...] КСМ.

— Комсам. біл. на імя Шышко Я., выд. Чэрвеньскім РК КСМ.

— Комсам. біл. за № 125480, імя Дзякавай Марты выд. Чакавіцк[ім] РК КСМ.

— Комсам. біл. за № 5953, на і[мя] Плаўкінда В. Д. выд. Гомельск. А[К КСМ].

— Комсам. біл. за № 121298, імя Чупрыса Д. Т.. выд. Лагойск[ім] РККСМ.

— Студэнцк. пасьвед. за № 235, імя Савасьцей В., выд. Мен. БПТ.

— Комсам. біл. за № 134525, імя Пунтуса Я. М., выд. Лагойск[ім] АК КСМ.

— Комсам біл. за 1202262. на і[мя] Каўрыгі, выд. Мен, АК КСМ.

— Комсам. біл за № 131641, на і[мя] Кваткоўскага, выд. Вузьдзенск. [Р]КСМ.

— Біржавая картка юнсэкцыі імя Бароўца В., выд. Мен. Бірж[а] Працы.

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599